НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

№ 1 (113), ЛЮТЫ 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

## ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ ЛЕКАР – ПЕНСІЯНЕР

Работа ўстаноў аховы здароўя ў Шумілінскім раёне па-ранейшаму ацэньваецца па мадэлях канчатковых вынікаў.

У Шумілінскай раённай бальніцы прайшоў галоўны сход года – выніковы медыцынска-санітарны савет. Наша меркаванне аб эфектыўнасці медыцынскай дапамогі складаецца з асабістых канкрэтных выпадкаў. А якую ж ацэнку сваёй дзейнасці даюць самі медыкі?

Са справаздачным дакладам на сходзе перад калегамі выступіў галоўны ўрач раёна К. Ф. Баканаў. Ён адзначыў, што нягледзячы на многія цяжкасці дня, медработнікі здолелі справіцца з даведзенымі патрабаваннямі ў ажыццяўленні дзейнасці па розных накірунках. Што патрэбна, каб у хворых з'явілася жаданне пры любым недамаганні неадкладна звяртацца да ўрача? Найперш – забяспячэнне кадрамі. За апошнія тры гады ў раён паступіла 15 урачоў. Аднак на сённяшні дзень на поўную ўкамплектаванасць выйсці не ўдалося: кожны чацвёрты ўрач – пенсіянер. Апроч таго, назіраецца востры дэфіцыт урачоў агульнай практыкі – усяго пяць спецыялістаў, а патрэбна ўдвая болей. І гэта пры ўсім тым, што побач, каля паўсотні кіламетраў знаходзіцца медыцынскі ўніверсітэт. Праўда і тое, што кожны год выпускнікоў да нас размяркоўваюць, але з-за адсутнасці годных жыллёвых умоваў маладыя спецыялісты праз пару год збягаюць з раёна.

У сувязі са сказаным намеснік начальніка аховы здароўя аблвыканкама А. У. Андрушкін, які прысутнічаў на савеце, абяцаў вырашыць гэта набалелае пытанне. Дарэчы, такія абяцанкі кожны год калектыву райбальніцы даюць чыноўнікі з вобласці, але воз і цяпер там.

Вялікую ўвагу ў выступленні галоўны ўрач надаў Нацыянальнай праграме дэмаграфічнай бяспекі. Галоўная праблема, што выклікала актыўнае калектыўнае абмеркаванне, выплыла са статыстыкі, якую неаднаразова агучвалі з трыбуны кіраўнікі аддзяленняў райбальніцы. У статыстыцы смяротнасці па-ранейшаму на першым месцы смяротнасць ад захворванняў сістэмы кровавароту – 40,5 адсоткаў. Паказчыкі смяротнасці не знізіліся, асабліва непакоіць медыкаў такая з'ява, як суіцыд. Летась было 37 спроб самагубстваў, а назаўсёды развіталіся з жыццём 18 чалавек. Ад алкагольных сурагатаў памерлі 19 чалавек, смерць ад злоўжывання алкаголем у разрэзе ўсіх паказчыкаў смяротнасці займае 26,9 адсоткаў. Востра стаіць пытанне гіпертанічных хворых, "памаладзелі" інсульты. Жаночы алкагалізм у нашым раёне забірае ўсё новыя ахвяры: на ўліку ў нарколага стаяць ужо 232 жанчыны.

Прыярытэтным накірункам у дзейнасці шумілінскіх медыкаў з'яўляецца ахова мацярынства і дзяцінства. Але факты – упартая рэч. У мінулым годзе памерла чацвёра дзяцей (усе яны былі з неблаганадзейных сем'яў). Акрамя таго, 202 дзіцяці пражывае ў сацыяльна небяспечных сем'ях. Увогуле, колькасць зваротаў да педыятраў павялічылася: 1396 выпадкаў (у 2008 годзе было 994).

Несуцяшальная сітуацыя склалася і ў набыцці новага лабараторна-дыягнастычнага абсталявання. Да прыкладу, у кабінеце афтальмолага зусім састарэлая медтэхніка 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Да таго ж у кабінетах урачоў, якія прымаюць хворых, няма кампутараў. І гэта ў пачатку 21 стагоддзя, калі кожны школьнік пачатковых класаў не ўяўляе сваё жыццё без кампутара.

Падводзячы вынікі работы, шумілінскія медыкі спыніліся і на асноўных задачах на бягучы год. У ліку іх – далейшае развіццё пярвічнай медыка-санітарнай дапамогі, развіццё медыцынскіх паслуг жанчынам і дзецям, дыспансерызацыя працаздольнага насельніцтва, зніжэнне інваліднасці ў працаздольным узросце, паляпшэнне якасці прафілактычных аглядаў і іншыя. Хочацца верыць, што ў гэтым годзе ўсе заданыя праграмы нашым лекарам удасца паспяхова вырашыць. Бо менавіта ад іх вырашэння будзе залежаць здароўе жыхароў нашага раёна.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## ПРАБЛЕМЫ ВЫХАВАННЯ

# ДА НАСТАЎНІКА З ПАВАГАЙ

Безумоўна, настаўнікам павінен быць чалавек, які прызваны Богам для выхавання. У гэтым заключаецца Божая воля, каб гэты чалавек абвяшчаў дзецям і моладзі дабро, радасць, мудрасць, перш за ўсё паказваючы гэта на ўласным прыкладзе. Настаўнік, як указвае само слова, павінен навучыць чаму-небудзь вучня, а перш за ўсё – годна даваць сабе рады ў жыцці, ведаць, што значыць рабіць дабро, а што зло. А для таго, каб больш дасканала валодаць любімай справай, настаўнікі ўдзельнічаюць у конкурсах прафесійнага майстэрства. Нядаўна ў Амбросавіцкай сярэдняй школе пад эгідай упраўлення адукацыі педагагічны калектыў праводзіў конкурсныя іспыты. За права стаць фіналістам на працягу двух тыдняў змагаліся адзінаццаць педагогаў – амаль увесь калектыў школы. І хаця ўсе настаўнікі ўжо маюць пэўны вопыт, шлях да фіналу быў вельмі складаны. Настаўнікі прадстаўлялі на конкурс цікавыя, рознапланавыя відэа- і практычныя матэрыялы, педагагічныя эсэ. На адкрытых уроках праходзілі тэарэтычныя спаборніцтвы па педагогіке і псіхалогіі. Падобныя мерапрыемствы дапамагаюць педагогам быць больш шчырымі, самааддадзенымі, майстарскі падбіраць той ключык даверу і ўзаемапавагі да кожнага вучня. Фінал конкурсу быў падзелены на этапы. У творчым самапрадстаўленні настаўнікам было неабходна творча і дынамічна распавядаць аб фактах сваёй біяграфіі, аб навучальнай установе, у якой працуюць, аб сваіх выхаванцах, сакрэтах сваіх напрацовак. Трэба адзначыць, што канкурсанты падрыхтаваліся даволі адказна і грунтоўна. Пры падвядзенні агульных вынікаў конкурснае журы аднагалосна вызначыла прызёраў. Імі сталі настаўніца беларускай мовы і літаратуры Людміла Шчарбакова і настаўніца пачатковых класаў Раіса Шкурко. А лепшай сярод педагогаў прызналі настаўніцу хіміі і біялогіі Святлану Кучмарову. Калі сам настаўнік дае прыклад стараннасці, сур'ёзнасці, прафесійнага падыходу да абавязкаў, павагі да іншай асобы, тады безумоўна, і ён застанецца ў вучнёўскай памяці інтэлігентным і паважаным чалавекам.

**У. Амбросаў.**

## КУЛЬТУРНЫЯ ПАДЗЕІ

# АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ НА ВЁСЦЫ

Як паказала практыка, сельскія Дамы культуры адчыняюцца для масавых гледачоў толькі даты, калі здараецца якое-небудзь адметнае свята. У гэтым выпадку перад вясковымі жыхарамі выступаюць самадзейныя артысты – найчасцей мясцовыя або прыязджаюць з раёна. А ці часта бываюць на вёсцы прафесійныя артысты? Варта сказаць, што для гэтага патрабуюцца адпаведныя ўмовы. Апошнім часам дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы культурнае жыццё на вёсцы ўлады намагаюцца падняць да гарадскога ўзроўню. Нельга пакінуць таленавітых дзяцей без заняткаў музыкай, выяўленчым мастацтвам, харэаграфіяй. Таму ў аграгарадках адкрыліся сучасныя філарманічныя пляцоўкі з тэхнічным аснашчэннем. У аграгарадку Мікіціха нядаўна збудавалі сельскі Цэнтр культуры, у якім была прадугледжана і філарманічная пляцоўка. Менавіта з гэтай нагоды ў аграгарадок завіталі артысты з Віцебскай абласной філармоніі. Ансамбль музыкі, песні і танца "Талака" за паўтары гадзіны прыемна здзівіў вясковых гледачоў. У рэпертуары ансамбля былі і фальклорныя беларускія песні, і пляскі, і нават агністы цыганскі танец. Да таго ж шыкоўныя касцюмы надавалі выступленню непаўторны стыль. І гэта яшчэ не ўсё. У бліжэйшым будучым прафесійныя артысты з Віцебска зноў наведаюць аграгарадок Мікіціху, у наступны раз будзе філарманічная праграма для дзяцей. Агульную культуру чалавека трэба выхоўваць з дзяцінства. Менавіта яна потым уплывае на ўсё астатняе жыццё.

**С. Горкі.**




# "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

# АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – наша падзяка. Словам, сувенірам.***

# ВЫСТАВЫ ДЗІЦЯЧЫХ РАБОТ

**Юныя ўдзельнікі фотамастацкага гуртка, што створаны ў Башнёўскай сярэдняй школе, правялі выставы сваіх работ. Яе галоўная мэта – прыцягнуць увагу аднавяскоўцаў да самых цікавых куткоў родных мясцін. Кожная з работ, якая адлюстроўвае ціхую вулачку, асобны дом ці проста адзінокае дрэва, створана з дзіцячай непасрэднасцю і шчырасцю. А яшчэ – з любоўю да роднай вёсачкі. Цікава глядзець на фотаздымкі Святланы Балашэўскай: у аб'ектыў яе фотаапарата трапілі самы прыгожыя кампазіцыі з кветак. Разам з тым Святлана захапляецца кветкаводствам і агародніцтвам, прымае ўдзел у раённых конкурсах. Студэнтка ветэрынарнай акадэміі Яўгенія Болахава стварае эскізы мадэляў для клуба аматараў дызайну, шые касцюмы для пастановак. У Башнеўскім сельскім клубе бібліятэкар Ала Сафончык і загадчыца Ірына Бондарава ладзілі выставы па тэматыцы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Акрамя таго, работніцы культуры праводзілі выставы дзіцячых малюнкаў і на малочна-таварнай ферме вёскі Башні. Наведаць выставу і пабачыць малюнкі мелі магчымасць працаўнікі мясцовай гаспадаркі, бацькі і дзеці.**

Алесь Прыбярэжны.

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# Часцей унікаць у праблемы вёскі

Жыць праблемамі вяскоўцаў, штодзённа іх трымаць на кантролі і вырашаць – гэта найперш непасрэдны клопат старшыні сельвыканкама. Дзе старшыня сельвыканкама не губляе сувязі з насельніцтвам, часцей бывае ў вёсках сельсавета, а не ў райцэнтры, там і праблем значна меней. А для таго, каб трымаць на канролі адміністрацыю сельсавета, існуе больш вышэйшае звяно кіраўнічай вертыкалі – раённы Савет дэпутатаў. Як паказала практыка папярэдніх гадоў, станоўчыя вынікі даюць гэтак званыя выязныя пасяджэнні груп чыноўнікаў з райвыканкама. Такія сустрэчы раённай улады з насельніцтвам ужо сталі традыцыйнымі ў Шумілінскім раёне. Для вырашэння злабадзённых пытанняў людзям не абавязкова ехаць у раён, да таго ж вяскоўцы маюць магчымасць у прысутнасці больш высокага начальства выказаць заўвагі і прапановы, даць ацэнку работы органаў мясцовага самакіравання. Аднак нягледзячы на павелічэнне колькасці праведзеных Дзён сельсавета, колькасць скаргаў і зваротаў грамадзян па-ранейшаму не зменшылася. Так было і на гэты раз. У Сіроцінскі сельсавет завітала выязная група супрацоўнікаў з райвыканкама на чале са старшынёй райсавета І. М. Новікавай. На пачатку мерапрыемства Ірына Мікалаеўна агучыла інфармацыю для старэйшын вёскі аб прэйскурантах па ўсіх відах паслуг, якія аказваюцца ў раёне. Ужо распрацаваны новыя расцэнкі ў сферы бытавых паслуг, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, апрацоўцы прыватных агародаў. Але здараецца так, што людзі не заўсёды ведаюць, хто павінен займацца дастаўкай дроў да спажыўца, высякаць кустоўе і хмызняк у межах населеннага пункта, рамантаваць у хлявах дахі каля шматкватэрных дамоў. Відавочна, што гэта недапрацоўкі мясцовых саветаў. Як абслугоўваюць насельніцтва, што пражывае на тэрыторыі Сіроцінскага сельсавета, прадстаўнікі райвыканкама даведаліся ад саміх вяскоўцаў. Людзей непакоілі злабадзённыя праблемы, якія не ў стане вырашыць сіламі мясцовай гаспадаркі. Да прыкладу, у вёсцы Зямцы дрэнная якасць пітной вады. Тут збудавалі новую водаправодную сетку, але вада ўсё роўна цячэ ржавая. Як высветлілася, патрабуецца ачыстка абсталявання ў водапорнай вежы. Дагэтуль не спілавалі аварыйныя дрэвы ў вёсцы Мосарава, шмат у каго з сяльчан не працуе праваднoе радыё. Жыхары з Сянькова прасілі кіраўніцтва раёна прыслаць да іх аўталаўку – да бліжэйшага магазіна пенсіянерам цяжка дабірацца. Былі нараканні і на ўчастковага міліцыянта, які не з'явіўся па выкліку ў Слабадскі сельскі клуб. Разам з тым былі і станоўчыя моманты ў стварэнні добрых умоў для жыцця жыхароў дадзенага населенага пункта. Снежныя завеі ніяк не перашкодзілі людзям з аддаленых вёсак дабірацца да цэнтра ¬¬– бульдозер кожны дзень расчышчаў дарогі. Ацаніць зробленае ўладамі могуць толькі простыя людзі на мксцах. Цалкам верагодна, што тыя праблемы, якія былі ўзняты ў ходзе правядзення дня Сіроцінскага сельсавета маглі б і не ўзнікаць, каб вырашаліся старшынёй сельсавета своечасова. Дэпутацкі корпус нібыта ёсць, старэйшыны прызначаны, вось толькі да цеснай сувязі з насельніцтвам пакуль яшчэ далёка.

**Алесь Шумскі.**

# ШЭФАЎ НА ЎСІХ НЕ ХАПІЛА

Кіраўнікі нашага раёна рэгулярна праводзяць рабочыя нарады, на якіх напамінаюць сваім падначаленым аб персанальнай адказнасці па навядзенні парадку на зямлі. Пры гэтым галоўны накірунак работы Шумілінскага райвыканкама – адносіны да людзей. Менавіта пра бяспеку людзей і ў будзённым жыцці, і на рабочых месцах ішла гаворка на пасяджэнні супрацоўнікаў райвыканкама і спецыялістаў розных службаў, якое правёў кіраўнік раёна В. А. Падляшчук. Вальдэмар Антонавіч заклікаў прысутных больш рашуча змагацца з п'янствам і алкагалізмам, якія становяцца прычынамі гібелі людзей. Разам з тым быў зроблены кароткі пералік тых спраў, аб якіх залежыць стан падведамасных пабудоў. Некаторыя аб'екты несвоечасова ачышчаюцца ад ледзяшоў і снегу, дапушчана нядбайнасць і ў патрабаваннях да пажарнай бяспекі. Адначасова праходзіла і пасяджэнне раённага штаба па добраўпарадкаванню, кіраўніком якога з'яўляецца старшыня райсавета І. М. Новікава. У сваю чаргу Ірына Мікалаеўна прапанавала над кожным населеным пунктам узяць "шэфства". Цяпер дапамагаць жыхарам вёсак павінны не толькі старэйшыны і дэпутаты, але і замацаваныя за імі прадпрыемствы і арганізацыі нашага раёна. Як аказалася, шэфаў на ўсіх не хапіла (у раёне 251 вёска, г. п. Шуміліна і Обаль), прыйшлося шукаць добраахвотнікаў з Кастрычніцкага раёна г. Віцебска. Была зацверджана праграма "Двары". Як і заўжды, асноўныя клопаты па навядзенні парадку на асабістых падворках будуць выконваць гаспадары. Ад актыўнага ўдзелу кожнага жыхара раёна залежыць добраўпарадкаванне тэрыторыі. Трэба сказаць, што ў мінулым годзе такая дзейнасць вялася пакуль недастаткова. Асобныя прысядзібныя ўчасткі літаральна патаналі ў пустазеллі, агароджа вакол дамоў была разламаная, участкі недакошаныя. Прынамсі, чым тлумачыцца такая аператыўнасць шумілінскага кіраўніцтва ў падрыхтоўцы да веснавых работ? Прычына вядомая: напярэдадні надарылася рэйдавая праверка з вобласці. Сёлета з дзяржбюджэту гаспадаркам вобласці цэнтралізавана выдзелена 32 мільярды рублёў на паліва і іншыя мэты для падрыхтоўкі палёў да пасяўной кампаніі. Якім жа чынам выкарыстоўваюцца сродкі, ці будзе аддача ад укладзеных грошай? На гэтыя і іншыя пытанні камісія аблсельгасхарчу шукала адказы, адначасова правяраючы гатоўнасць тэхнікі і стан мехдвароў на Шумілішчыне. Паводле намесніка старшыні аблвыканкама Э. Дям'янава, у той безгаспадарчасці, якая пануе ў шумілінскіх мехдварах і майстэрнях вінаваты найперш кіраўнік раёна В. Падляшчук і яго намеснік А. Кавалёнак. Амаль у кожным другім калгасе майстэрні захламленыя, налічваецца шмат адзінак неадрамантаванай тэхнікі, графікі рамонту не вызначаныя. Прадпісанні абласных спецыялістаў з восені не выкананы, а грошы расходуюцца не рацыянальна. Сапсаваныя вузлы і агрэгаты на Віцебскі маторарамонтны завод не адпраўлены, хаця гэта шумілінскія тэхнікі павінны былі зрабіць яшчэ ў лістападзе. Калі цяпер тэрмінова пачнуць здымаць маторы і каробкі перадач з трактароў, а затым адпраўляць на завод, то заказ будзе зроблены не пазней, як за тры тыдні. Па ўсяму бачна, шумілінскія механізатары сустракаць веснавыя работы не спяшаюцца. Абласныя начальнікі ўказалі гаспадаркам нашага раён на пралікі і недахопы, цяпер яны будуць знаходзіцца ў больш пільным полі зроку кантралёраў.

**Алесь Шумскі.**

## НАША СПАДЧЫНА

# ХТО АХОЎВАЕ ШУМІЛІНСКІХ САЛАЎЁЎ?

Птушкі з'яўляюцца неад'емлемай часткай прыроды. Яны жывуць побач з намі, уражваюць сваёй разнастайнасцю. Птушкі прыгожыя, цудоўныя спевакі, здзіўляюць сваёй пяшчотнай турботай аб патомстве, натхняюць на вялікія творы мастакоў і паэтаў, з'яўляюцца сімвалам палёту і свабоды. Але птушкам пагражае шмат небяспекі . Перш за ўсё, знішчэнне месцаў іх пражывання, прамысловае атручванненавакольнагаасяроддзя, не рэгуліруемае паляванне, асабліва ў вясновы перыяд, таксідэрмія. Каб захаваць птушак, было створана добраахвотнае аб'яднанне грамадзян. Асноўная мэта арганізацыі – захаванне біялагічнай разнастайнасці і заахвочванне насельніцтва да актыўнай аховы прыроды. У канцы студзеня Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Ахова птушак Бацькаўшчыны" падводзіла вынікі дзейнасці арганізацыі. Па выніках работы за мінулы год Шумілінскае аддзяленне ГА АПБ сярод чатырнаццаці аддзяленняў заняло другое месца. Аддзяленне было створана ў 2006 годзе – адзінаццаць сяброў грамадскай арганізацыі стварылі раённае аддзяленне. Усё пачыналася з праекта з міжнароднага праекта TASIS па выкарыстанні вопыту Еўразвяза па захаванні запаведнікаў і заказнікаў у супрацоўніцтве з насельніцтвам і ўладай. Што цяпер робіць наша раённая экалагічная арганізацыя, каб захаваць птушак? Найбольш удалыя рэалізаваныя праекты – гэта "Інвентарызацыя векавых дрэў на тэрыторыі Шумілінскага раёна","Вывучэнне і вырошчванне раслін мясцовай флоры". Прынамсі, шмат карыснага даў маніторынг звычайна гняздуючых відаў птушак. На сённяшні дзень раённае аддзяленне АПБ налічвае 67 дарослых і 198 вучняў, 17 школьных экалагічных клубаў "Крылаты дазор". Дзякуючы ўдзелу у розных праектах у школах раёна пабагацела матэрыяльная і метадычная база. З'явіліся бінoклі, розныя вызначальнікі, нават мінілабараторыі для даследавання якасці вады. Школьнікі прымаюць актыўны ўдзел у падліках птушак. Нашы рупліўцы былі адзначаны ў 2007 годзе, калі па выніках падліку салаўёў атрымалі сертыфікат "Шуміліна –салаўіны гарадок". Наперадзе – новыя планы. Старшыня раённага аддзялення АПБ Іна Сінкевіч спадзяецца, што сёлета арганізацыя папоўніцца новымі сябрамі. А каб заахвоціць новых людзей да практычных дзеянняў, трэба ў першую чаргу пашырыць тэматыку экалагічных праектаў і мерапрыемстваў. І надалей актывісты АПБ будуць удзельнічаць ва ўсіх рэспубліканскіх акцыях "Жывая вясна" (сакавік-травень), Міжнародны дзень птушак (1 красавіка), салаўіныя ночы (14-15 тарўня) і іншыя. У рамках праекта па захаванню біяразнастайнасці адбудуцца акцыі, прысвечаныя бадай што,самаму галоўнаму прыроднаму багаццю раёна – Обальскаму балоту. Усіх шумілінцаў, хто не абыякавы да роднага краю, нашы экалагі запрашаюць да сяброўства ў арганізацыі, дзе можна прыняць удзел у кампаніях, акцыях, конкурсах і праектах. Будзе магчымасць убачыць фотаздымкі шумілінскага краявіду, паназіраць за птушкамі, пазнаёміцца з аднадумцамі, асвоіць новыя падыходы ў сферы аховы прыроды.

**С. Горкі.**

## НАША ГРАМАДСТВА

# АБ ПРАВАПАРУШЭННЯХ СЯРОД НЕПАЎНАЛЕТНІХ

Даўно заўважана: у якое асяроддзе трапляе чалавек, такім, у большасці ён і становіцца. Але калі бацькі не жадаюць ведаць, дзе і як іх дзіця бавіць вольны час, падлеткі самі пачынаюць "дарослае" жыццё. Яз звычайна, усё пачынаецца нібыта з нявінных свавольстваў. Аднак правапарушэнні – не дзіцячыя свавольствы. І за іх даводзіцца плаціць вельмі дорага, як бацькам, так і дзецям. Як папярэдзіць злачынствы ў падлеткавым асяроддзі? Як прымусіць нядбайных бацькоў поўнасцю кампенсоўваць затраты па ўтрыманню дзяцей на дзяржаўным забяспячэнні? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўвалі напрыканцы снежня ўдзельнікі пасяджэння райвыканкама, якое праводзіў старшыня раённай адміністрацыі В. А. Падляшчук. На пасяджэнне былі запрошаны службоўцы Шумілінскага раённага выканаўчага камітэта, прадстаўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама, першы намеснік пракурора вобласці У. У. Чадзюк. Гаворка вялася аб мерах па ўдасканаленню работы з непаўналетнімі па папярэджанню злачыннасці і правапарушэнняў у сярэдніх адукацыйных школах нашага раёна. На жаль, у раёне яшчэ хапае маладых юнакоў і дзяўчат, якія сваімі глупствамі калечаць лёс, пазбаўляюць сябе радасці нармальна жыць. Вельмі хацелася, каб гэта падлеткі ўсвядомілі. Але рэаліі сённяшняга жыцця прымушаюць гаварыць пра іншае. У мінулым годзе падлеткі ў нашым раёне здзейснілі 12 злачынстваў, а 14 маладзёнаў пастаўлены на ўлік да нарколага. А колькі такіх, якія штодня ламаюць агароджы, псуюць дарожныя знакі, распіваюць піва ў грамадскіх месцах, топчуць кветнікі? Усіх правапарушальнікаў на ўлік не паставіш. А каб гэтага не здарылася, не адбылося, трэба прадстаўнікам розных службаў, сістэмы адукацыі, медыцыны працаваць у звязку з супрацоўнікамі міліцыі. Пакуль што многія непаўналетнія, схільныя да асацыяльных паводзінаў, недаверліва ставяцца да людзей у пагонах. Таму акрамя рэйдаў, трэба рабіць больш ўпор з дзецьмі па месцы пражывання. У якасці прыкладу на пасяджэнні разглядалася работа трэнера Обальскай сярэдняй школы Пятра Ганушчанкі. Гэты настаўнік здолеў арганізаваць гурток грэка-рымскай барацьбы, якой захапіліся дзесяткі хлопчыкаў. Цяпер хлопцам ёсць куды падзець сябе вечарам. Апроч таго, у гэтай школе ладзіцца шмат прафілактычных мерапрыемстваў, у тым ліку і акцыя "Моладзь – за здаровы лад жыцця". Пра тое, як лепш арганізаваць адпачынак казалі і другія выступаючыя: начальнік аддзела адукацыі В. М. Саковіч, старшыня Обальскага сельвыканкама М. А. Будневіч, галоўны ўрач раёна К. Ф. Баканаў. Толькі своечасова прынятыя меры не дазволяць трапіць шумілінскім падлеткам на коўзкі шлях злачынства.

**Я. Вайтовіч.**

## ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# ДВОЙНОЙ УДАР

***Страна пожинает первые плоды трагедии 19 декабря, международной изоляции, в которой оказалась после президентских выборов. Если раньше рассуждения на эту тему имели абстрактный характер, то теперь Беларусь несет реальные экономические и политические потери. Москва принудила Минск к нефтяной капитуляции, а Запад ввел санкции.***

Судя по всему, та нефтяная свинья, которую подложила Россия, оказалась неожиданной для режима. Казалось, с подписанием и ратификацией Беларусью 17 соглашений о Едином экономическом пространстве в конце прошлого года осуществилась заветная мечта: получать российскую нефть без пошлин. Москва клятвенно обещала, В. Путин рассказывал о $4 млрд, которые якобы дарит РФ Минску. Белорусские официальные лица перед выборами уже считали барыши, раскрыли шире государственные карманы, куда потекут полным потоком нефтедоллары.

Увы, реальность оказалась суровой, еще перед Новым годом Россия опустила наших мечтателей с небес на грешную землю. Вместо пошлины нефтяные компании ввели наценку на каждую тонну нефти в размере $46. Учитывая конфликт Лукашенко с Западом, в Москве благоразумно рассудили, что ему некуда деваться, ибо поле для маневра резко сократилось. Минск долго сопротивлялся, но прекращение поставок нефти стало аргументом, который невозможно было проигнорировать. Нефтяной контракт заключен на условиях России.

В итоге углеводородной капитуляции Беларусь понесет существенные потери. Новые условия поставок российской нефти позволят ей заработать только чуть меньше $1 млрд, а не $4 млрд, как сказал В. Путин. Причем получение и этих денег белорусским бюджетом еще не гарантировано, а зависит от ряда обстоятельств. Например, правительство РФ намерено в марте повысить пошлины на соответствующие продукты. А это автоматически сократит бюджетный доход Беларуси.

Во-вторых, и это самое главное, Москва навязала формулу цены на нефть, согласно которой Беларусь получит обещанный доход, если закупит весь запланированный годовой объем нефтяного импорта из России (21,7 млн.т.). Т. е. если Беларусь купит венесуэльскую или азербайджанскую нефть, то наценка российских нефтяных компаний увеличивается, и, соответственно, доходы белорусского бюджета уменьшаются.

И вот здесь-то зарыта собака. РФ стремится заблокировать своему союзнику альтернативные источники нефти. А ведь Беларусь уже заключила соглашение о нефтяных поставках из Венесуэлы, Азербайджана, о транзите по украинскому нефтепроводу Одесса—Броды. И теперь Минску предстоит делать нелегкий выбор. Российская нефть дешевле, но при условии монополии РФ на ее поставку. Нефть из других стран дороже, но она создает альтернативу монопольным поставкам из России.

Одновременно белорусское руководство получило жесткую оплеуху от Запада. 31 января ЕС введены визовые санкции в отношении 158 белорусских должностных лиц, включая А. Лукашенко. США кроме визовых, финансовых ограничений запретил сотрудничество с лидским заводом «Лакокраска» и полоцким «Стекловолокно».

Эти решения имеют больше символическое значение, нежели непосредственно угрожают белорусским властям. Рассуждая абстрактно, возможно, их и не стоило бы рассматривать как мягкие. В конце концов, ЕС и США делают только то, что могут в данный момент.

Проблема в том, что обещалось нечто гораздо более серьезное. Вспомним, с какими грозными заявлениями выступали официальные лица США и стран ЕС. Они носили характер ультиматума, утверждалось, что у Минска осталось только несколько дней на размышление, освобождение политзаключенных, после чего грянет возмездие. Были совместные статьи министров иностранных дел Германии, Польши, Швеции и Чехии в американской газете «The New York Times», а также министров иностранных дел Германии и Великобритании в «The Wall Street Journal». Они призывали дать решительный отпор А. Лукашенко. Была жесткая резолюция Европарламента, предусматривавшая множество санкций, включая спортивные.

И на этом фоне решения министров иностранных дел ЕС, равно как и США, выглядят слабыми. Гора родила мышь. Из огромной тучи, грома и молнии получился маленький дождь. Именно диссонанс между громкими заявлениями, угрозами и реальными результатами, между большим замахом и слабым ударом вызывает наибольшее количество вопросов. Если не собираетесь драться, то зачем было махать кулаками. Ведь в следующий раз в эти угрозы никто не поверит и не будет принимать их всерьез.

Причины мягкотелости ЕС кроются и в отсутствии единства среди европейских стран, и в нежелании жертвовать своими экономическими интересами, и в спорности эффективности жестких санкций.

Но появилось и новое обстоятельство. Арабский Восток оказался накануне революционного взрыва. Рушатся режимы проевропейские, светские, что может открыть дорогу для прихода к власти антизападных исламских фундаменталистов со всеми вытекающими отсюда последствиями. Кроме того, революции в Тунисе, Египте оказались совсем не «бархатными». Погибло уже более ста египтян. На этом фоне события в Беларуси 19 декабря выглядят совсем в другом свете.

Можно сказать, что и в этот раз А. Лукашенко в какой-то мере повезло. Ему нужно благодарить арабов. Однако, в любом случае, даже символические санкции являются юридическим оформлением политического конфликта между Беларусью и ЕС. Они знаменуют конец периода диалога, нормализации отношений, крах стратегии интеграции белорусского авторитаризма в европейские процессы.

Эти санкции ЕС будут иметь косвенное влияние и на экономику. В условиях кризиса отношений между Беларусью и Западом европейские инвесторы с большим недоверием станут смотреть на нашу страну. Белорусским властям станет гораздо сложнее получать кредиты международных финансовых организаций, банков ЕС.

Два удара одновременно со стороны России и Запада – это не случайность, а глубокая закономерность. И если санкции США и ЕС носят в большей мере форму политического давления, то РФ использует экономические рычаги. Конфликт с Западом, международная изоляция резко сужают дипломатические возможности Беларуси. Поскольку западный вектор оказался на время отрезанным, то стране снова придется лететь на одном крыле. Односторонняя ориентация на Россию ведет к тому, что Беларусь становится уязвимой перед российским давлением, что и показало противоборство по вопросу поставок нефти.

Таким образом, страна расплачивается за 19 декабря. Цена сохранения власти А. Лукашенко становится все более высокой.

**Валерий Карбалевич.**

## ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

# КАЗУС АЛЕСЯ МІХАЛЕВІЧА

Відавочна, што ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі для Алеся Міхалевіча быў толькі крокам у яго плане стварэння новага палітычнага руху. Маючы дастаткова сціплыя сродкі, Міхалевіч змог сабраць неабходныя для рэгістрацыі кандыдатам 100 тысяч подпісаў. Дапамог яму той факт, што ад удзелу ў кампаніі адмовіўся Аляксандр Мілінкевіч і шэраг рэгіянальных структур, якія працавалі б на лідара руху «За свабоду», перайшлі на бок Міхалевіча.

Гэта дало магчымасць выканаць «праграму мінімум» — зарэгістравацца кандыдатам у прэзідэнты.

Сваю агітацыйную кампанію Міхалевіч будаваў у заходнім стылі, адрасна працуючы па вызначаных электаральных групах: вайскоўцы, чыноўнікі, сілавыя структуры, нацыянальныя і рэлігійныя меншасці… Акрамя яго ніхто да гэтых групаў не звяртаўся. А Міхалевіч дзейнічаў досыць рашуча. У Гродне, напрыклад, ён заявіўся ў аблвыканкам і пайшоў па кабінетах чыноўнікаў, раздаючы ім агітацыйныя матэрыялы і заклікаючы падтрымаць сваю кандыдатуру.

Уявіце сабе шок чыноўніка, калі да яго ў кабінет нечакана заходзіць апазіцыйны кандыдат у прэзідэнты і прама пад партрэтам «паважанага Аляксандра Рыгоравіча» пачынае «гнуць сваю лінію».

Натуральна выклікалі міліцыю. Аднак загаду падымаць скандал не было і пасля праверкі дакументаў Міхалевіча шчасліва адпусцілі «на ўсе чатыры бакі».

У той час як Віталь Рымашэўскі, Рыгор Кастусёў ці нават Яраслаў Раманчук у сваіх выступах заклікалі прыхільнікаў выйсці 19 снежня на плошчу (я свядома пералічваю прозвішчы тых экс-кандыдатаў, якія не сядзяць) Міхалевіч нібы заклён паўтараў слоган ўлады — «Разам мы Беларусь», падкрэсліваючы, што ён і яго прыхільнікі «таксама Беларусь», а таму трэба дамаўляцца.

Паколькі ўдзел у прэзідэнцкай гонцы было толькі тактычным крокам у яго плане, то выразных адносінаў да акцыі пратэсту 19 снежня ў Міхалевіча не было. Ён спрабаваў лавіраваць. З аднаго боку ён вымушаны быў у ёй удзельнічаць, каб пазбегнуць таўра здрадніка, з другога боку гэта не павінна было перакрэсліваць яго планаў па працягу пасля выбараў дыялогу з уладай і фарміравання новай адкрытай на дыялог з Лукашэнкам палітычнай сілы.

Таму ён прыйшоў на Кастрычніцкую плошчу, але не выступаў…

Далейшы вынік вядомы. Арышт, змяшчэнне ў «амерыканку» і апрацоўка па-поўнай.

Па сутнасці, уначы з 19 на 20 снежня ўсім кандыдатам у прэзыдэнты Лукашэнка праз сваіх «паўнамоцных прадстаўнікоў» (толькі ў выпадку з Яраславам Раманчуком гэта былі людзі з Адміністрацыі прэзідэнта ўзмоцненыя супрацоўнікамі Службы бяспекі з астатнімі размаўлялі КДБ-істы) прапанаваў безумоўную капітуляцыю.

Супернік павінен быў прадэманстраваць, што ён маральна раздушаны, павінен быў поўзаць на каленях.

Ці будзе гэта тэлезваротам ці «тлумачальная запіска прэзідэнту Рэспублікі Беларусь» не так і важна. Зброю свайго ўласнага маральнага знішчэння апазіцыянеры маглі выбраць самі.

Хто прыняў гэтыя ўмовы — той пазбег турмы.

Уяўляю здзіўленне КДБ калі справа дайшла да Міхалевіча. «Прадыялогавы» і антырасійскі палітык (прыклад Рыгора Кастусёва паказвае, што можна было ўсё валіць на Расею, і такім чынам часткова захаваць свой твар), павінен быў быць «слабым звяном». Усё павінна было прайсці хутка, як па масле… Але не тут тое выйшла. Расчараваў Алесь, прыхільнікаў «дыялогу пад пратакол».

І сёння Міхалевіч сядзіць з адной прычыны — ён не хоча быць марыянеткай, ён застаецца палітыкам, які нават у экстрэмальных сітуацыях самастойна прымае рашэнні. І з гэтым Лукашэнка не хоча змірыцца. Лёс Міхалевіча паказвае, што сёння шчырая стаўка на палітычны дыялог з Лукашэнкам, бессэнсоўная. Бо дамаўляцца ні з кім дыктатар не збіраецца. Гаворка можа ісці толькі аб безагаворачнай капітуляцыі. Альбо Лукашэнка альбо яго праціўнікаў.

**Андрэй ПАЧОБУТ.**

## НАША ЎЛАДА



# ЛУКАШЭНКА — НА ЛЫЖАХ, АПАНЭНТЫ — НА НАРАХ

***Пакуль альтэрнатыўныя кандыдаты ў прэзыдэнты застаюцца ў турмах ці загойваюць раны пасьля выбарчай кампаніі, Аляксандар Лукашэнка, якога ЦВК абвясьціў прэзыдэнтам, выбраўся ў адпачынак. Гэты тыдзень ён са сваім бліжэйшым атачэньнем і 6-гадовым сынам Мікалаем бавіць час на расейскім курорце Сочы.***

Штодзённая інтэрнэт-газэта sochi-24.ru піша, што кіраўнік Беларусі ўзяў кароткатэрміновы адпачынак, падчас якога праверыць ход рэалізацыі праекту ўзьвядзеньня ў гарналыжным цэнтры «Красная паляна» біятлённага комплексу, лыжаролернай трасы і гатэлю. Аднак, як кажа галоўны рэдактар выданьня Вадзім Карчагін, Лукашэнка практычна не спускаецца з гор, таму, чым ён займаецца, публіцы невядома:

«Трэба сказаць, што толькі крыху больш за год нашае выданьне функцыянуе, але ні цягам гэтага пэрыяду, ні раней ніякіх публічных зьяўленьняў Лукашэнкі ў Сочы не назіралася».

Пры гэтым іншы сочынскі інфармацыйны рэсурс maks-portal.ru паведамляе: у выходныя Аляксандар Лукашэнка разам з малодшым сынам Мікалаем паўтары гадзіны каталіся на схілах горна-турыстычнага цэнтру канцэрну «Газпрам». Як падаюць відавочцы, бацька і сын дэманстравалі кляс на крутой трасе ў зоне «F». Лукашэнкава атачэньне вылучалася на тле астатняй публікі яркааранжавай амуніцыяй.

Падазраваны ў арганізацыі масавых беспарадкаў экс-кандыдат у прэзыдэнты Рыгор Кастусёў падобныя паводзіны земляка называе амаральнымі. І на ўсялякі выпадак нагадвае: пяць канкурэнтаў Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах, як і некалькі дзясяткаў іншых дэмакратычных актывістаў, літаральна ні за што могуць атрымаць па 15 гадоў турмы, і забаўляцца ў такіх умовах — не па-людзку: «Зразумела, што згодна зь беларускім заканадаўствам і кодэксам аб працы кожны чалавек мае права на адпачынак. Але ў дадзены момант, калі склалася такая пасьлявыбарчая сытуацыя, Лукашэнку ня варта было б ехаць адпачываць, пакуль ня скончыліся разборы па справах арыштаваных. Трэба канчаткова адпусьціць людзей, а тады ўжо са спакойным сумленьнем ехаць адпачываць. А зараз такі адпачынак выглядае пірам падчас чумы. Або нават выклікам. Таму я адмоўна стаўлюся да такіх забаваў прэзыдэнта».

У Сочы Лукашэнка стабільна наведваецца тры апошнія гады. Можна меркаваць, што пасьля аднаўленьня мараторыю на наведваньне Лукашэнкам і ягоным бліжэйшым атачэньнем Эўразьвязу і ЗША гэта будзе рэдкай магчымасьцю пакатацца не пад Лагойскам, а ў сапраўдных гарах. Згодна зь міждзяржаўнымі пагадненьнямі Расея перадала ва ўласнасьць Беларусі паўтара дзясятка гектараў зямлі ў пасёлку Красная паляна Адлераўскага раёну Краснадарскага краю, а беларусы расейцам — аналягічную колькасьць у Менску і вобласьці. Таму ў Краснай паляне Лукашэнка і пачувае сябе на правах гаспадара.

Між тым яшчэ нядаўна геаграфія ягоных паездак была нашмат шырэйшая. Год таму нечакана для эўрапейскай супольнасьці Лукашэнка зьявіўся ў швайцарскіх Альпах, дзе тыдзень сумяшчаў карыснае зь нібыта «дзелавымі перамовамі». Праз месяц, у сакавіку, перадысьлякаваўся на гарналыжную базу Капаоніка ў Сэрбіі, а адтуль — на армянскі курорт Цахкадзор. Таксама Лукашэнка пасьпеў пакатацца на лыжах падчас паездак у Казахстан і Расею.

Палітык Павал Знавец, сам вялікі аматар спорту, лічыць, што беларускі кіраўнік апынуўся ў досыць двухсэнсоўнай сытуацыі. Стасункі з Крамлём застаюцца нацягнутымі, Захад перад ім дзьверы зачыніў канчаткова, а ў выніку беларускі лідэр атрымаў своеасаблівы карт-блянш, каб чыніць некантраляваную сваволю на практычна ізаляванай тэрыторыі: «Лукашэнка, па сутнасьці, апынуўся ў пастцы. І ў Маскву здацца ня можа, бо там ён нікому не патрэбны, і на Захад калгаснага Банапарта пускаць неяк непрыстойна. І вось ён у пастцы. Але што ў такой сытуацыі застаецца? Застаецца толькі мацаваць ізаляцыю. І вось ён у гэтым пляне сканує сытуацыю, закручвае гайкі далей, палохае грамадзтва. Адным словам, заганяе назад джына ў бутэльку. Бо толькі трошкі выпусьціў пару дэмакратыі, а зараз зноў назад усё заганяе, усіх запалохвае. А таму яму і начхаць на нейкія маральныя прынцыпы».

Нагадаем, што ў апошні дзень студзеня Рада Эўразьвязу на ўзроўні кіраўнікоў МЗС забараніла 157 беларускім чыноўнікам, у тым ліку Аляксандру Лукашэнку і двум ягоным старэйшым сынам, наведваць краіны абʼяднанай Эўропы. Аналягічны сьпіс ухвалілі і Злучаныя Штаты. Цяпер у Лукашэнкі застаецца небагатая альтэрнатыва для падарожжаў.

**Ігар Карней.**

## ПРАБЛЕМЫ ЭКАНОМІКІ

# Лукашэнка дыктуе ўмовы інвэстарам

На нарадзе па праблемах малочнай галіны 3 лютага кіраўнік Беларусі сфармуляваў патрабаваньні да інвэстараў. Тыя змогуць працаваць толькі на беларускіх умовах:

«Ніякага адыходу ад той мадэлі разьвіцьця Беларусі, якую мы вызначылі, быць не павінна. Ніякага „дзікага капіталізму“, паўтараю вам яшчэ раз. Сацыяльныя гарантыі для беларускага народу — перадусім».

Кіраўнік дзяржавы незадаволены тым, што супрацоўніцтва зь «Юнімілк» абмяжоўваецца толькі перапрацоўкай і экспартам пітнога малака, то бок вывазам сыравіны. А стварэнне абяцаных сучасных малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў зацягваецца.

**Аляксандар Лукашэнка ва ўльтыматыўнай форме запатрабаваў, каб замежныя інвэстары працавалі ў Беларусі толькі на беларускіх умовах. Аднаму з інвэстараў, вядомай француска-расейскай фірме «Данон-Юнімілк», пастаўлена ўмова — цягам першага кварталу выканаць усе даручэньні кіраўніка дзяржавы, у тым ліку і наконт таго, каб несьці сацыяльную нагрузку. Інакш, заявіў, Лукашэнка, «вы на рынку Беларусі больш працаваць ня будзеце». Ці пойдуць замежныя інвэстары на такіх умовах у Беларусь?**

Сярод краін, якія апошнім часам актыўна прыглядаюцца да беларускай эканомікі, ёсьць і Літва. Віцэ-прэзыдэнт сельскагаспадарчай канфэдэрацыі «Arvi kalakutai» Альфонсас-Сігітас Тамашунас сёньня сказаў «Свабодзе», што з такімі ўльтыматыўнымі патрабаваньнямі ў іншых краінах літоўскія бізнэсоўцы дагэтуль не сустракаліся. Мы ведаем, што ў Беларусі існуе такое спэцыфічнае патрабаваньне да інвэстараў, як хуткая пабудова імі сацыяльных аб'ектаў, кажа спадар Тамашунас:

«Але ж спачатку ж трэба грошы зарабіць. Мы звычайна робім шмат якія рэчы самі. Напрыклад, паляпшаем дарогі, людзям дапамагаем — найперш, зразумела, тым, хто працуе на нашых прадпрыемствах. Але самае галоўнае — мы спраўна плацім дзяржаве, у якой працуем, падаткі. І калі мы пасьпяхова працуем, то дзяржава атрымлівае ад нас вельмі добрую выгаду.

Як мне падаецца, можа, інвэстарам і наагул не патрэбна ўзводзіць сацыяльныя аб'екты. Бо дзяржава атрымлівае ад іх падаткі, і, мабыць, ёй самой прасьцей вырашыць, на што патраціць гэтыя грошы. Бо калі мы пачнём багата інвэставаць у сацыяльную, я назваў бы яе прамежкавай, сфэру, то тады нам будзе цяжка падтрымліваць канкурэнтаздольнасьць сваёй прадукцыі. З аднаго боку, калі інвэстары ствараюць сацыяльныя аб'екты, то дзяржаве здаецца, што яна ад гэтага выйграе. А насамрэч яна прайграе, таму што бюджэт атрымлівае значна меней сродкаў».

Палітоляг, дацэнт Маскоўскага інстытуту міжнародных дачыненьняў Кірыл Коктыш кажа: цяпер для інвэстыцый у любую краіну час зусім нязручны. А Беларусі зь яе правіламі, якія ўсталяваў Лукашэнка, інвэстары будуць пазьбягаць яшчэ больш:

«Сёньняшняе становішча ўсясьветнай эканомікі не спрыяе ніякім інвэстыцыям. Сёньня час, калі ўсе працягваюць страчваць. Фактычна ідзе барацьба за апошняга кліента. То бок ідзе барацьба не за максымізацыю прыбыткаў, а за мінімізацыю стратаў.

А беларуская мадэль — яна вытворная ад расейскай. І наагул, выгадная альбо нявыгадная сацыяльных праграмаў лічыцца вельмі проста. Калі бізнэсовец плаціць, напрыклад, 20% у выглядзе падаткаў і 20% у выглядзе сацыяльных праграм, ці 40% у выглядзе падаткаў, то асаблівай розьніцы няма. Пытаньне толькі ў тым, зь якой кішэні яны разьмяркоўваюцца».

**Уладзімер Глод.**

## СВЕТ АБ БЕЛАРУСІ

DW-WORLD.DE DEUTSCHE WELLE

# МІЛІНКЕВІЧ ЗАКЛІКАЎ ЕЗ НЕ БЫЦЬ НАІЎНЫМ З ЛУКАШЭНКАМ

ПРА ТОЕ, ЯК ЕЎРОПА ПАВІННА ВЕСЦІ СЯБЕ АДНОСНА ЛУКАШЭНКІ І ЯГО АПАНЕНТАЎ, ВЯЛАСЯ ГАВОРКА Ў АКАДЭМІІ ФОНДУ ІМЯ КОНРАДА АДЭНАЎЭРА Ў БЕРЛІНЕ, ДЗЕ З ЛЮТАГА АДБЫЛАСЯ ДЫСКУСІЯ ПАД НАЗВАЙ "БЕЛАРУСКАЯ АПАЗІЦЫЯ Ў НЕБЯСПЕЦЫ". УДЗЕЛЬНІКІ ДЫСКУСІІ - НЯМЕЦКІЯ ЭКСПЕРТЫ І ПАЛІТЫКІ, А ТАКСАМА ЛІДЭР РУХУ "ЗА СВАБОДУ" АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ - АБМЕРКАВАЛІ МАГЧЫМЫЯ СЦЭНАРЫ РАЗВІЦЦЯ ПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ І РЭАКЦЫІ НА ЯЕ З БОКУ ЕЎРОПЫ, ПАВЕДАМЛЯЕ DEUTSCHE WELLE.

### Першачарговыя задачы

Аляксандр Мілінкевіч, адкрываючы дыскусію, падкрэсліў, што на парадку дня еўрапейцаў і грамадзянскай супольнасці Беларусі стаяць некалькі важных пытанняў. Першае - вызваліць прадстаўнікоў апазіцыі і грамадзянскіх актывістаў, якія сталі ахвярамі рэпрэсій пасля прэзідэнцкіх выбараў.Другое-ажыццявіць прынятыя ЕС санкцыі супраць беларускага кіраўніцтва і паклапаціцца аб тым, каб яны не ўдарылі па насельніцтве краіны. І толькі потым ужо прыступіць да дыялогу з рэжымам. «Дыялог жыццёва неабходны беларусам. Без яго нічога не будзе. І хоць цяжка ўявіць, што мы станем Паўночнай Карэяй, але краіна будзе толькі зачыняцца», - упэўнены Мілінкевіч.

### Санкцыі супраць Лукашэнкі, але не супраць насельніцтва

Намеснік старшыні фракцыі ХДС/ХСС у бундэстагу Арнольд Ваатц, каментуючы заявы Мілінкевіча, падкрэсліў, што санкцыі ЕС абавязкова павінны быць узважанымі і асцярожнымі. Каб змяніць сітуацыю, дамагчыся дэмакратычных пераменаў у Беларусі, патрабуецца палітычны і дыпламатычны ціск на Лукашэнку.

Пры гэтым, як лічыць Ваатц, трэба растлумачыць Лукашэнку, што ў партнёраў заўсёды павінна быць раўнавага паміж тым, што яны гатовыя «даваць» і «атрымліваць». «Калі мы з ім стасуемся, то чакаем сустрэчных крокаў у пытанні дыялогу з Захадам. Але яшчэ больш важны дыялог дыктатарскага рэжыму з беларускім народам. Гэтага мы павінны дамагчыся», - сказаў Ваатц.

### Еўропа не павінна быць наіўнай

Аляксандр Мілінкевіч, які раней неаднаразова выказваўся за дыялог Брусэля з Мінскам, заклікаў ЕС не быць наіўным, разлічваючы на тое, што Лукашэнка можна задобрыць палёгкамі. Палітык папрасіў удзельнікаў дыскусіі падумаць аб тым, ці былі дзеянні еўрапейцаў і апазіцыі ў Беларусі ў мінулым правільнымі?

Паводле яго, многія палітыкі ў Еўропе часта паводзяць сябе, як ківач - вагаючыся ад адной крайнасці да іншай. Лідэр Руху «За Свабоду» нагадаў прысутным аб тым, што калі ў ранейшыя гады Лукашэнка ўзмацняў ціск на апанентаў, калі з'яўляліся палітвязні, Еўропа надавала больш увагі апазіцыі. Затым, падкрэсліў Мілінкевіч, усё кардынальна змянілася. «Калі пачаўся дыялог, калі многія з нас сказалі, што ён патрэбны, увага ЕС пераключылася на ўладу. І некаторыя еўрапейскія палітыкі пачалі ў нейкай ступені саромецца працаваць з апазіцыяй, з праваабарончымі арганізацыямі. Маўляў, уладам гэта не вельмі падабаецца», - заўважыў ён.

## САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

# ВЫБАРЫ СКОНЧАНЫ. КАМУНАЛКА ПАЙШЛА Ў ШАЛЁНЫ РОСТ

Тарыфы на электрычнасць і газ выраслі задняй датай на 11—83%.

Электраэнергія падаражэла на 12,0—31,4% — са 125,3 да 164,6 рубля за кілават у дамах з электраплітамі і са 173 да 193,8 рубля ў дамах з газавымі плітамі (аднаставачныя тарыфы).

Кошт халоднай вады павялічыўся на 21,2% — з 385,7 да 467,5 рубля за кубаметр.

Тарыф на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння застаўся на ўзроўні 43.458,3 рубля на 1 Гкал, тарыф на каналізацыю — 242 рублі за кубаметр вады, тарыф на вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адыходаў — 4.764 рубля за кубаметр, за карыстанне ліфтам — 1.421 рубель за аднаго жыхара.

Кошт газу для аднаго жыльца, які жыве ў кватэры з газавай плітой і гарачым водазабеспячэннем, без газавага лічыльніка складзе 6.789,6 рубля супраць 3.696 (рост на 83,7%).

Па асобных пазіцыях газ падаражэў больш чым удвая.

У прыватнасці, тарыф на тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў вырас на 4,4% — з 296 да 309 рублёў у месяц за 1 кв. метр агульнай плошчы жылога памяшкання.

Магі з Саўміна пры гэтым абяцаюць, што агульны кошт жыровак вырасце ўсяго на 5 даляраў.

Цяперашнія тарыфы дзейнічаюць з 1 лютага. Ранейшыя прымяняліся з 1 студзеня 2009 года ў адпаведнасці з пастановай урада ад 16 снежня 2008 года.

**Дзмітрый Уласаў, БелаПАН.**

## УСХОДНІ СУСЕД

# Расея лічыць паводзіны Менску непрымальнымі

«Тое, што адбылося ў Беларусі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў – непрымальнае, – заявіў міністар замежных справаў Расеі Сяргей Лаўроў на брыфінгу ў Маскве.

Лаўроў адзначыў удзел Расеі ў выпрацоўцы нядаўняга рашэньня Рады Эўразьвязу: "Мы актыўна ўдзельнічалі ў выпрацоўцы рашэньня Камітэту міністраў Рады Эўропы ў сярэдзіне студзеня – рашэньня, якое было прынятае адзінагалосна, і ў якім патрабуецца неадкладна вызваліць арыштаваных кандыдатаў у прэзыдэнты, журналістаў і праваабаронцаў, забясьпечыць выкананьне правоў чалавека і палітычных свабодаў, паважаць эўрапейскія каштоўнасьці і прынцыпы. Мы разьлічваем, што нашы беларускія калегі апэратыўна і пазытыўна адрэагуюць на гэтае кансэнсуснае рашэньне Рады Эўропы».

Разам з тым Лаўроў адзначыў, што Расея не падтрымлівае ізаляцыі Беларусі. «Мы перакананы, што вырашаць гэтыя задачы трэба праз спрыяньне дыялёгу, які ўцягваў бы Беларусь у шматбаковыя працэсы і тым самым дапамагаў бы прасоўваць эканамічныя рэформы і ўмацоўваць дэмакратыю ў гэтай краіне. Вырашаць гэтыя задачы аднабаковымі санкцыямі, якія прымаюцца з палітычных матываў, каб пагоршыць сацыяльна-эканамічную сытуацыю – гэта ня той шлях," – зазначыў міністар замежных справаў Расеі.

**Радыё Свабода.**

## НАША ГРАМАДСТВА

# А БЕСПОРЯДКИ ГДЕ?

Ну, вот не могла я поверить, что разбитые стекла в Доме правительства уголовный закон позволяет трактовать как «массовые беспорядки». И правильно делала.

Свеженький Научно-практический комментарий к Уголовному кодексу, который, наконец, появился в магазинах Минска, свидетельствует, что статья 293 УК (а именно по ней предъявлено обвинение узникам «американки») написана не про события 19 декабря.

Цитирую наших теоретиков уголовного права:

«Массовые беспорядки в смысле ст.293 НЕПРЕМЕННО должны сопровождаться насилием над личностью, погромами, поджогами, уничтожением имущества, вооруженным сопротивлением представителям власти. Иные действия участников толпы, выразившиеся в нарушении общественного порядка, влекут административную ответственность, а при грубом нарушении общественного порядка могут влечь ответственность по ст.339 (Хулиганство -- от штрафа до трех лет) или 342 (Организация и подготовка действий, грубо нарушающих общественный порядок, либо активное участие в них -- от штрафа до трех лет)».

Что-нибудь 19 декабря горело? Поджог вычеркиваем.

«Насилие над личностью» можно вменить разве что спецназу, потому что оно подразумевает нанесение телесных повреждений, побоев, истязание, лишение свободы. Этим, как раз, стражи закона и отличились.

«Уничтожение имущества», согласно все тому же изданию, -- это приведение вещи в такое состояние, когда она не может быть использована по назначению либо перестает существовать вовсе. Дом правительства, слава Богу, по назначению используют и сегодня, и он очень даже пригоден для чиновников. В общем, тоже не подходит.

«Вооруженное сопротивление» -- это тоже не махание кулаками или палками. В наличии должно было быть именно оружие, что ни на каких видеокадрах не зафиксировано.

Наконец, «погром» это тоже не разбитые стекла. На юридическом языке это собирательное понятие, включающее насилие, хищения, уничтожение или повреждение имущества. Причем, перечисление идет через запятую: то есть не или насилие, или хищение, а и то, и другое, и третье вместе. И вот не было этого!

Более того, отдельно оговорено, что «не могут рассматриваться как организаторы массовых беспорядков лица, например, организовавшие санкционированное или несанкционированное шествие с правомерными целями, но впоследствии утратившие контроль над поведением толпы». И уж тем более, в СИЗО сидят не организатору, потому что они не призывали бить стекла.

Одним словом, согласно белорусской юридической науке, произошедшее 19 декабря в Минске нельзя трактовать как массовые беспорядки, поскольку того, что должно составлять «объективную сторону преступления» по ст.293 УК, просто не было в наличии.

И теперь вопросом остается то, найдутся ли в стране люди, которые приблизят теорию к практике. В частности, разъяснения, которые я цитировала, написаны Заслуженным юристом Республики Беларусь, профессором, заместителем директора по научной работе и заведующим кафедрой судебной деятельности Института переподготовки и повышения квалификации судей, работников прокуратуры, судов и учреждений юстиции Белорусского государственного университета Александром Барковым. Осмелится ли он подать голос? Осмелится ли он провести ликбез для генпрокурора Григория Василевича, который подзабыл учебники.

**Светлана Калинкина.**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна